# Зярнятка 29

25 сакавіка 2018 г. Пальмовая нядзеля, Год В

*Благаслаўлёны той, хто прыходзіць у імя Пана* *Мк 11, 1-10*

Калі наблізіліся да Ерузалема, да Бэтфагіі і Бэтаніі, да гары Аліўнай, Езус паслаў двух сваіх вучняў і сказаў ім: Ідзіце ў вёску, што перад вамі, і адразу, як увойдзеце ў яе, знойдзеце прывязанае асляня, на якое ніхто з людзей яшчэ не сядаў. Адвяжыце яго і прывядзіце. А калі хтосьці вам скажа, навошта вы гэта робіце, адкажыце: Ён патрэбны Пану, і зараз жа адашле зноў яго сюды.




Яны пайшлі і знайшлі асляня, прывязанае каля дзвярэй знадворку, на вуліцы, і адвязалі яго. І некаторыя з тых, хто стаяў там, казалі ім: Што вы адвязваеце асляня? Яны адказалі ім, як наказаў Езус, і тыя адпусцілі іх.

І прывялі да Езуса асляня, і паклалі на яго сваё адзенне, а Ён сеў на яго. І многія слалі адзенне сваё на дарозе, а іншыя — галінкі, зрэзаныя на палях. І тыя, хто ішоў спераду і следам за Ім, усклікалі:
Гасанна!
Благаслаўлёны той,
хто прыходзіць у імя Пана!
Благаслаўлёнае валадарства
айца нашага Давіда,
якое надыходзіць!
Гасанна на вышынях!

*Гэта слова Пана.*

**Божа, мой Божа, чаму мяне пакінуў?**

# Знайдзі 15 адрозненняў.





Пане Езу! Ты за нас цярпеў ад ранаў, дзякую Табе за дар адкуплення, за тое, што аддаў за мяне сваё жыццё на крыжы; за тое, што падараваў мне неба; за тое, што любіш мяне бязмежна і бясконца; за тое, што збавіў мяне ад граху і смерці! Дзякую Табе, Езу, Сыне Божы, за ............................ (дапоўні малітву сваімі словамі). Амэн.